# ВЫКАРЫСТАННЕ АКТЫЎНЫХ ФОРМ АБМЕНУ ВОПЫТАМ У СІСТЭМЕ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ МУЗЕЙНЫХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСІ

**І. Б. Лапцёнак,** *начальнік аддзела навукова-метадычнага забеспячэння развіцця музейнай дзейнасці Інстытута культуры Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У XXI ст. культура і адукацыя адносяцца да асноўных паказчыкаў узроўню развіцця грамадства, з'яўляюцца фактарамі забеспячэння яго прагрэсу. Вялікая ўвага надаецца пытанням захавання самабытнасці беларускай культуры, развіцця інавацыйных ініцыятыў ва ўстановах культуры і адукацыі, выкарыстання прынцыпова новых падыходаў і механізмаў.

Інстытут культуры Беларусі – установа адукацыі, якая займаецца навукова-метадычным забеспячэннем дзейнасці ўстаноў культуры, павышэннем кваліфікацыі, перападрыхтоўкай, метадычнай вучобай спецыялістаў і кіруючых кадраў культуры. У 2011 г. у інстытуце распрацаваны курсы павышэння кваліфікацыі па некалькіх практычных кірунках – навукова-фондавым, навукова-экспазіцыйным, дзейнасці ў галіне інфармацыйных тэхналогій. У 2012 г. запланавана работа па чатырох кірунках, з якіх два з'яўляюцца тэматычнымі – па музейным менеджменце і маркетынгу і актуальных аспектах культурна-адукацыйнай дзейнасці. На працягу 2011–2012 гг. інстытут праводзіць перападрыхтоўку кадраў на базе вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «экскурсійна-масавая работа» з прысваеннем кваліфікацыі «музеязнавец».

На сёння сярод агульных стратэгій навучання слухачоў можна вылучыць некалькі, якія ўжываюцца ў практыцы інстытута, галоўныя з іх – інфармацыйная і праблемная.

Для рэалізацыі інфармацыйнай стратэгіі шырока выкарыстоўваецца метад адукацыйнай трансляцыі. Асноўная задача яго – даць пэўныя веды слухачам, спрыяць, каб яны склаліся ў пэўную сістэму, былі дастаткова асэнсаваны і замацаваны. Шырокае прымяненне інфармацыйнай стратэгіі адбываецца падчас перападрыхтоўкі слухачоў. Асаблівае значэнне пры гэтым мае

выкарыстанне найноўшых ведаў, актуальных для развіцця музейнай справы ў адпаведнасці з сусветнымі тэндэнцыямі, рэкамендацыямі ЮНЕСКА / ІКОМ. Немалаважным з'яўляецца і мабільнасць у забеспячэнні варыятыўнасці зместу курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Эфектыўнасць інфармацыйнай стратэгіі ў значнай ступені залежыць ад актуальнасці, навізны і якасці адукацыйных праграм. У 2012 г. у сувязі з павышэннем патрабаванняў да ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі музейных спецыялістаў, пашырэннем іх функцыянальных абавязкаў, неабходнасцю ўліку сучасных тэндэнцый у развіцці музейнай справы плануецца ўвядзенне новай спецыяльнасці «музейная камунікацыя» і ўнясенне змяненняў у структуру тыпавога вучэбнага плана перападрыхтоўкі.

Адным з актуальных ракурсаў сучаснага музеязнаўства з'яўляецца асэнсаванне тых тэндэнцый, якія з'явіліся вынікам развіцця музеяў у другой палове XX – пачатку XXI ст. і вызначылі яго сучасны стан. Традыцыйнае разуменне музея як захавальніка культурных каштоўнасцей зведала значную трансфармацыю, звязаную са зменамі, што адбыліся ў музейнай практыцы. Пашырэнне функцый музеяў, павелічэнне сферы іх сацыяльнага ахопу патрабуюць пераасэнсавання, якое дазваляе аналізаваць шматлікасць новых рэалій музейнай практыкі з пазіцый агульных прынцыпаў. Адной з важнейшых галін, істотных для ўвасаблення новага разумення музея, з'яўляецца музейная камунікацыя. Увядзенне дысцыпліны ў праграмы перападрыхтоўкі будзе садзейнічаць азнаямленню слухачоў з метадалогіяй інтэрактыўнай дзейнасці сучаснага музея, новымі музейнымі тэхналогіямі і магчымасцямі іх прымянення ў сучасным мультыкультурным асяроддзі.

На сучасным этапе развіцця камунікатыўны падыход належыць да ліку магістральных кірункаў музеязнаўчай думкі, якія вызначаюць стыль мыслення сусветнай супольнасці. У сувязі з гэтым атрыманне музейнымі спецыялістамі ведаў па спецыфіцы камунікатыўных працэсаў з'яўляецца патрэбным і неабходным.

Сучасная практыка сведчыць аб значным павышэнні ролі музеяў у сферы турызму і дынамічным развіцці музейных комплексаў, што абумоўлівае неабходнасць увядзення ў вучэбны план перападрыхтоўкі яшчэ адной дысцыпліны – «музейны турызм». Пазіцыяніраванне музея як аднаго з галоўных аб'ектаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турыстычнага паказу, выкліканае сітуацыяй самавызначэння і пошуку дадатковых пазабюджэтных крыніц фінансавання, стварыла перадумовы для развіцця кірунку музейнага турызму.

Музейны турызм уяўляе сабой дзейнасць музеяў у сферы пазнавальнага турызму па стварэнні і рэалізацыі разнастайных турысцкіх прадуктаў музейнага характару. Ён заснаваны на ідэі комплекснага паказу гісторыі і культуры тэрыторый, якія ўваходзяць у сферу навуковых, культурна-адукацыйных і іншых інтарэсаў музея, абумоўленых спецыфікай і складам музейных калекцый. Звесткі, што адносяцца да розных аспектаў развіцця музейнага турызму, значна дапоўняць прафесійную адукацыю слухачоў, дапамогуць ім авалодаць асноўнымі паняццямі турысцкай дзейнасці, базавымі працэсамі, звязанымі са стварэннем музейна-турысцкіх прадуктаў, інтэрпрэтацыяй культурнай спадчыны тэрыторыі, распрацоўкай спецыфічнага крэатыву, пашырэннем рынкаў збыту музейнай прадукцыі і інш.

Музеязнаўчая адукацыя павінна ахопліваць максімальна шырокае кола кірункаў пры пастаянным пашырэнні сферы практычнай дзейнасці. Укараненне новых дысцыплін будзе садзейнічаць падрыхтоўцы спецыялістаў, здольных эфектыўна, з выкарыстаннем інавацыйных методык і сучасных тэхналогій, рэалізоўваць спецыяльныя веды і кампетэнцыі ў сферы музейнай дзейнасці.

З мэтай рэалізацыі інфармацыйнай стратэгіі інстытута аддзел навукова-метадычнага забеспячэння развіцця музейнай дзейнасці праводзіць семінары ў рамках метадычнай вучобы кадраў. Для абмену вопытам і вывучэння новых тэхналогій на семінары запрашаюцца спецыялісты вядучых музеяў Беларусі і замежжа. У 2011 г. прайшоў міжнародны навукова-практычны семінар «Праблемы забеспячэння захаванасці музейных фондаў, выкарыстання сучасных тэхналогій маркіроўкі і алічбоўкі музейных прадметаў», на якім беларускія спецыялісты атрымалі магчымасць абмену вопытам з вядучымі спецыялістамі Дзяржаўнага гістарычнага музея (РФ, г. Масква). На семінары разглядаліся праблемы маркіроўкі і алічбоўкі музейных прадметаў з боку практыкаў музейнай справы і экспертаў, распрацоўшчыкаў сучасных праграм. Былі ўзняты пытанні выкарыстання сучасных тэхналогій і іх адпаведнасці патрабаванням захаванасці і бяспекі музейных фондаў. Сярод галоўных вынікаў семінара – атрыманне новай інфармацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

азнаямленне з тэхналогіямі, якія знаходзяцца ў цэнтры навукова-даследчай дзейнасці вядучых музейных устаноў замежжа, вывучэнне іх вопыту па ўкараненні новых практык, наладжванне кантактаў з музеямі замежжа, буйнейшай еўрапейскай карпарацыяй у галіне алічбоўкі музейных фондаў «Электронны архіў» і інш.

Вялікае значэнне ў педагагічным працэсе мае актывізацыя адукацыі слухачоў. Адукацыя з'яўляецца эфектыўнай і дасягае добрых вынікаў, калі слухачы адкрыты для навучання і актыўна ўключаюцца ва ўзаемаадносіны і супрацоўніцтва з іншымі ўдзельнікамі працэсу навучання, маюць магчымасць для рэалізацыі ўласнага патэнцыялу, атрымліваюць веды па тэмах, з якімі ім давядзецца сутыкнуцца ў сваёй прафесійнай дзейнасці. Усе гэтыя ўмовы выконваюцца, калі прымяняецца інтэрактыўны рэжым навучання, заснаваны на дыялогу і супрацоўніцтве ўсіх суб'ектаў. Вузлавы момант праблемнага навучання – вырашэнне актуальных праблем, сумесны пошук адказаў на пытанні, якія нярэдка не маюць адназначнага разумення.

Праблемная стратэгія з'яўляецца адной з галоўных пры рэалізацыі адукацыйных праграм курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, правядзенні метадычнай вучобы музейных спецыялістаў. Таму большасць навукова-практычных семінараў і круглых сталоў, якія арганізуюцца ў інстытуце, заснавана на абмеркаванні актуальных пытанняў і праблем.

Спецыфіка навучання слухачоў выяўляецца ў іх актыўнай пазіцыі ў навучальным працэсе. Змест адукацыі пастаянна пашыраецца, і значнай крыніцай яго папаўнення з'яўляецца абмен вопытам спецыялістамі. Метады адукацыі – гэта найперш спосабы сумеснай дзейнасці выкладчыка і слухачоў, камунікацыі паміж слухачамі. Інтэрактыўнае навучанне з'яўляецца адным з сучасных кірункаў актыўнага навучання. Яно заснавана на выкарыстанні форм сумеснай дзейнасці і актыўных форм абмену вопытам: усе ўдзельнікі адукацыйнага працэсу ўзаемадзейнічаюць, абменьваюцца інфармацыяй, сумесна вырашаюць праблемы, мадэліруюць сітуацыі, ацэньваюць дзеянні калег і ўласныя паводзіны, паглыбляюцца ў рэальную атмасферу дзелавога супрацоўніцтва.

Магчымасці інтэрактыўнага навучання асабліва шырока раскрываюцца і садзейнічаюць эфектыўнасці і выніковасці працэсу менавіта ў адукацыі дарослых. У іх (у адрозненне ад навучэнцаў школ і студэнтаў), па-першае, ужо сфарміраваны дастатковыя камунікатыўныя ўменні для забеспячэння магчымасці пазітыўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міжсуб'ектнага ўзаемадзеяння, па-другое, як правіла, ёсць пэўны практычны вопыт, у тым ліку і асабісты, як аснова для абмеркавання, пастаноўкі пэўных праблем.

Творчы пошук выкладчыкаў Інстытута культуры Беларусі накіраваны на ўкараненне ў вучэбны працэс новых форм і тэхналогій навучання, актыўных форм абмену вопытам з абавязковым прыцягненнем у якасці выкладчыкаў вядучых спецыялістаў-практыкаў, якія рэалізуюць інавацыйныя ідэі ў педагагічнай і кіраўніцкай дзейнасці.

«Круглы стол», трэнінг, навукова-практычны семінар, майстэрня з'яўляюцца такімі формамі навучання, якія адкрываюць шырокія магчымасці для актыўнага абмену інфармацыяй, вопытам, выказвання свайго пункту гледжання. У межах курсаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі музейных спецыялістаў рэгулярна праводзяцца дзелавыя і ролевыя гульні, трэнінгі ў малых групах і інш.

Майстар-класы адбываюцца з прыцягненнем не толькі супрацоўнікаў музеяў, але і іншых установаў. Так, у межах семінара «Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі музейных прадметаў» з удзелам спецыялістаў Інстытута фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі быў праведзены майстар-клас па выкарыстанні мабільнага лазернага спектрометра, які плануецца ў перспектыве актыўна выкарыстоўваць для экспрэснага мікрааналізу гісторыка-культурных каштоўнасцей, пры правядзенні тэхналагічнай, гістарычнай і мастацтвазнаўчай экспертызы музейных прадметаў. Майстар-класы з удзелам рэстаўратараў арганізуюцца на базе рэстаўрацыйных майстэрняў Нацыянальнага мастацкага музея. На базе літаратурных музеяў г. Мінска падчас семінара, прысвечанага інтэрактыўным формам работы, прайшоў майстар-клас у межах рэспубліканскага праекта «5 музеяў за 5 дзён».

Інстытут укараняе ў практыку сваёй дзейнасці як рэальныя метады і формы навучання (тэматычныя дыскусіі, майстэрні і інш.), так і імітацыйныя (дзелавыя гульні, імітацыйныя практыкаванні, трэнінгі). Найбольш распаўсюджанай формай адукацыі слухачоў з'яўляецца групавая работа, у тым ліку ў малых групах. Метады адукацыі заснаваны на тэхналогіі асэнсавання, арыентаваны на вырашэнне праблем. Так, у межах выкладання музейнага менеджменту і маркетынгу былі распрацаваны ролевыя гульні, якія апрабіраваны на некалькіх групах слухачоў па тэмах «Стварэнне пазітыўнага іміджу музея», «Дыскусія як новая форма музейнай камунікацыі» і інш. Асаблівасцю гульняў з'яўляўся абавязковы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдзел у ёй кожнага слухача. Правядзенне ролевых гульняў вызначалася высокай канцэнтрацыяй актыўнага абмену думкамі, з шырокім прымяненнем метаду мазгавога штурму. У большасці выпадкаў ролевая гульня перарасла ў дзелавую. Такія формы работы не толькі садзейнічаюць павышэнню эфектыўнасці засваення новага матэрыялу, але і спрыяюць разгляду актульных праблем музейнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ